# Радок пра родны куток

Конкурс на лепшы твор, прысвечаны малой радзіме, быў абвешчаны ў лютым “Сельскай газетай” і Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Заяўкі на яго можна было дасылаць у рэдакцыю да 26 красавіка. У ліку пераможцаў конкурсу “Радок пра родны куток” аказалася і я. Усе пераможцы былі запрошаны на прэзентацыю “Сельскай газеты”, якая адбылася падчас XXII Міжнароднай спецыялізаванай выставы “СМІ ў Беларусі” на галоўнай сцэне форуму.

Як і астатнія ўдзельнікі мерапрыемства, я расказала гасцям выставы пра сябе і прачытала твор, якому рэдакцыя аддала пальму першынства. Затым адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў. Я вельмі рада, што аказалася пераможцай конкурсу “Радок пра родны куток”. Дзякуючы гэтай падзеі, убачыла шмат цікавага і атрымала безліч станоўчых эмоцый.

## Сцяжынкамі малой радзімы

Няхай спяшае час імклівы,
Ты сумам сэрца не трывож.
Сцяжынкамі малой радзімы
Прайдзіся ранкам басанож.

Тут хлеб смачней і дзень яснейшы,
І неба тут заўжды вышэй.
Тут крок зрабіў ты самы першы.
Няма кутка зямлі мілей!

Самотны ты або шчаслівы.
У дні надзей, у дні трывог
Сцяжынкі любае радзімы
Паклічуць зноў з усіх дарог.

**Наталля ЦВІРКО,** паэтэса, член СПБ

**На здымку**: цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу "Радок пра родны куток" падчас XXII Міжнароднай спецыялізаванай выставы “СМІ ў Беларусі”. Май, 2018. Трэцяя злева – Наталля Цвірко.

***

***Мы сардэчна віншуем нашу калегу, паэтэсу Наталлю ЦВІРКО з перамогай у рэспубліканскім літаратурным конкурсе “Радок пра родны куток”, жадаем ёй далейшых поспехаў на ніве літаратурнай творчасці і ў справе ўвасаблення ў мастацкім слове вобраза малой радзімы. Так трымаць, Наталля!***

**Калектыў**
**Гродзенскага абласнога аддзялення**
**Саюза пісьменнікаў Беларусі**




XXII Международная специализированная выставка «СМІ Ў БЕЛАРУСІ»
СМІ ў Беларусі
ПРИКАЗ №1
СЕЛЬСКАЯ ГАЗЕТА
СЕЛЬСКАЯ ГАЗЕТА
СЕЛЬСКАЯ ГАЗЕТА